Уладзімір МАМОНЬКА

# І Ў ВУЧОБЕ БЫВАЮЦЬ СВЯТЫ

Беларускі універсітэт культуры за мінулы год здолеў голасна і годна заявіць пра сваё крэда — стаць унікальнай навучальнай установай. Экзамен здаваўся перад атэстацыйнай камісіяй Дзяржаўнай інспекцыі навучальных устаноў Міністэрства адукацыі, у склад якой уваходзілі вядучыя навукоўцы і творцы краіны, як кажуць у народзе, па ўсіх параметрах, і вытрыманы паспяхова. ВНУ быў уручаны адпаведны атэстат з ёмкім запісам: «...з улікам шматгадовага вопыту падрыхтоўкі спецыялістаў, дастаткова высокага ўзроўню і зместу навучальна-выхаваўчага працэсу, матэрыяльна-тэхнічнай базы, вялікага кадравага патэнцыялу прафесарска-выкладчыцкага саставу, вучэбна-выхаваўчага і навукова-метадычнага персаналу, дастаткова эфектыўнай вучэбна-навуковай базы, добрага ўзроўню ведаў, якія паказалі студэнты па базавай і спецыяльнай падрыхтоўцы, атэставаць Беларускі універсітэт культуры, а таксама пацвердзіць адпаведнасць яго статусу ўстановы універсітэцкага тыпу».

Гэтая прэамбула адпавядае шмат чаму добраму ў працы яго калектыву. Але галоўнае, напэўна, у тым, што універсітэт заўсёды сумленна дбаў пра нацыянальную культуру беларусаў, не забываючы і пра глыбінку, шчодра аддаваў людзям мастацтва і талент сваіх выхаванцаў і выкладчыкаў. На сцэне яны заўсёды разам, на сцэне яны — артысты!

Творчыя справаздачы мастацкіх кафедраў, а іх болей за дзесяць, пачалі стала праводзіцца на лепшых сцэнічных пляцоўках сталіцы з 1989 года. На такіх імпрэзах звычайна паказваецца ўсё лепшае, што напрацавана за навучальны год. А гэта не толькі мастацкія нумары, а і новыя канцэртныя групы і калектывы, сярод якіх ансамблі «Валачобнікі», «Грамніцы», эстрадна-сімфанічны, народных інструментаў і духавы аркестры, інструментальны калектыў «Спадчына», ансамблі «Талака», «Туцці» і іншыя, практычна па ўсіх жанрах мастацтва. Іх любяць і ведаюць не толькі ў нас, на Беларусі. З выездамі за мяжу справы вельмі складаныя, бо вымагаюць вялікіх грошай. Але і яны ўсё ж адбываюцца: што спонсар падкіне (а іх, на жаль, становіцца ўсё менш), калі-нікалі дапаможа чым-небудзь і роднае Міністэрства культуры. А тады да ўжо адзначанага слова «ведаюць» дабаўляем і словы «многія замежныя гледачы» — Францыі, Англіі, Галандыі, Германіі, Польшчы, ЗША. Ведаюць, любяць, цэняць і запрашаюць. Ведаючы пра наш гаротны стан, запрашаюць на ўмовах: абы толькі аплацілі дарогу туды і назад. Астатнія выдаткі бяруць на сябе.

Гэта вельмі добра, бо на Беларусі заўсёды не забываліся пра вымоўе «на людзей паглядзець і сябе паказаць». «Паказваем і бачым, што рухаемся ў патрэбным накірунку», — з гонарам гаворыць рэктар універсітэта, акадэмік Акадэміі адукацыі Рэспублікі Беларусь прафесар Ядвіга Грыгаровіч.

У красавіку ў клубе Камітэта дзяржаўнай бяспекі, у яго даволі ўтульнай і добра знаёмай многім мінчанам зале, адбыўся канцэрт кафедры харэаграфіі. З'ява звыклая, але некаторыя аспекты прымушаюць вылучыць яе з агульнай канвы і пагаварыць пра гэта асобна. Праграма складалася з дзвюх частак. Першая была аддадзена нанова створанаму ансамблю беларускай абрадавай харэаграфіі, другая па-



Абрадавае вакальна-пластычнае дзейства «Вялікдзень на Беларусі»



**Пластычная замалёўка з «Роздуму аб сённяшнім жыцці»**

будавана на сучасных танцавальных мініяцюрах.

«Роздум аб сённяшнім жыцці» — так назвалі сваю работу студэнты-завочнікі чацвёртага курса універсітэта. Харэаграфічныя кампазіцыі «Яма», «Іржа», «Усё той жа вечны трокутнік», «Рытмы сённяшняга дня», пластычныя эцюды «Сцяна», «Рэўнасць», «Ноша», танцавальныя мініяцюры «Метраном», «Шмат шуму з нічога», нягледзячы на слова «сучасныя», усё ж уяўлялі сабою даволі традыцыйныя па цяперашнім часе пластычныя знаходкі. Тое, што сёння з незвычайнай шпаркасцю трасфармуецца ва ўсім свеце, асабліва ў краінах з адсталай нацыянальнай самасвядомасцю. Усе яны ў больш-менш роўнай ступені прафесійна і дэталёва распрацаваны і з добрым густам выкананы студэнтамі Ю. Мітрафанавай, Г. Такуновай, Н. Філіпавай, А. Амельчанка, А. Бацян, М. Маляўкінай, У. Шыльцом і В. Палушкінай пад музыку, як гэта пазначана ў праграме, «сучасных кампазітараў у выкананні замежных вакальна-інструментальных груп». Такія працы лёгка ўспрымаюцца гледачом, хутка становяцца папулярнымі, як, дарэчы, і хутка... знікаюць з мастацкіх даляглядаў, каб даць дарогу такім жа па сутнасці сваёй матывам. Гэта з галіны мастацтва Барыса Маісеева, лёгкая рытмічная музыка, харэаграфія з прэтэнзіямі на філасофскія абагульненні...

Мне заўсёды кідалася ў вочы тое, што музыка, драматургія, харэаграфія, жывапіс — ніколі не прыцягвалі да сябе ўвагу нявыхаванага натоўпу, прыналежнасцю да якога так любілі і любяць ганарыцца некаторыя дзяржаўныя мужы, і які, нягледзячы на сваю шматлікасць, ніколі не быў народам, але з апірышчам на які робяць амаль усе сацыяльныя перавароты. І наадварот, прымітыўнае, закручанае ў яркую абгортку амаль што імгненна ў гэтых колах становіцца шлягерам. Гэта, відаць, і ёсць асноўныя рысы касмапалітызму з некаторымі іншымі яго сінонімамі. З'явы, якая сваёй пачварнай прыцягальнасцю і ўсёдазволенасцю, як гэта ні парадаксальна — вытанчанасцю, заўсёды трымала і трымае пад сваімі стрэламі ўсё нацыянальнае.

Прыпамінаецца балет «Кругазварот». Думкі вечныя, агульначалавечыя праблемы. Але апранутыя ў нацыянальную вопратку, прывязаныя да зямлі беларускай — яны становяцца жывымі і... уздзейнічаюць стваральна, на карысць нацыі, народа, людзей, а значыцца, і нагул для Жыцця!

А таму вельмі добрым і цёплым веяла са сцэны ад першага канцэртнага аддзялення: сцэнічна-абрадавага, вакальна-пластычнага дзейства па матывах беларускіх вясковых старажытных абрадаў і рэлігійных святаў пад агульнай назвай «Вялікдзень на Беларусі». Паказанае каталіцкім і праваслаўным Вялікаднямі, гэтае дзейства ўспрымалася да таго ж надзвычай актуальна і ўяўляла сабою раўнапраўны сінтэз вакальна-песеннага, народнаінструментальнага і размоўнага жанру. Студэнты трэцяга курса А. Салянік, С. Цітовіч, Н. Капарыхаў, Н. Адамовіч, А. Пінчук, Ю. Вушакова, Т. Жук, І. Пратасеня, А. Лебедзева і Ю. Сакольчык, апранутыя ў стылізаваныя «пад танец» беларускія касцюмы, літаральна плялі карункі ў драматычнай мізансцэнцы «Скора Вялічка», ці ў абрадавым дзействе «Як сустракалася Зіма з Аўдуськай-вясноўкай», ці ў кампазіцыі «Гром, Гром, Гром — выйдзі, Гром!».

Практычна гэта першая сур'ёзная і глыбокая заяўка кафедры на права звацца навукова-творчым і метадычным цэнтрам танцавальнай культуры Беларусі. Дарога да гэтай падзеі пракладвалася здаўна. Асабліва карысной дзейнасцю творчай лабараторыі пад кіраўніцтвам доктара мастацтвазнаўства, прафесара Юліі Чурко, аднаго з аўтараў названага вышэй балета. І вось вынік — паказ гледачу цэласнай нацыянальнай праграмы. Звяртае на сябе ўвагу шэраг істотных момантаў, якія пацвярджаюць



**Удзельнікі спектакля. У цэнтры — Вольга БЯЛЯЕВА**

грунтоўнасць творчых пошукаў выкладчыцкага калектыву кафедры. Па-першае, ужо адзначаныя падыходы да стварэння касцюмаў і сцэнічнай атрыбутыкі. Лялька, якая сімвалізуе злосную і добрую вёсны, певень у рытуальна-абрадавым дзействе «Ахвярапрынашэнне», што ад страху не ведае, што робіць, — знёс вялікае яйка і іншае, вытрымліваецца ў народна-традыцыйным стылі, вядома ж, з аглядкай на матэрыяльна-тэхнічныя магчымасці ВНУ. Па-другое, гэта смелае і прафесійнае ўвядзенне ў творчую палітру выканаўца-харэографа сцэнічнага тэкста. Трэба адзначыць, тэкста адпрацаванага, узятага з рэальнага жыцця нашых продкаў і выдатна выкананага артыстамі.

Гэта было. Але не ў тэатрах Зорыча і Тызенгаўза, дзе прытрымліваліся чыстага еўрапейскага эталону. Гэта было ў мастацкім жыцці простага народа. Але не ў натоўпе! Гэта тое народна-класічнае, што ў свой час не было развіта і што сёння небеспаспяхова імкнецца аднавіць Беларускі універсітэт культуры.

«Божанька, хачу, каб дзетак у мяне было як на галаве валасоў», — у сваёй дзявочай прастаце просіць прыгожая дзяўчына і пры гэтым шчыра хрысціцца велікодным яйкам, як гэта было і засталося ў хрысціян-язычнікаў. І мы, гледзячы, пераносімся ў даўнія часы і, што галоўнае, верым у тое, што паказваецца, забываючыся, што гэта сцэна...

І музыка. Народныя напевы ў апрацоўцы Н. Трутневай і А. Ніжывінскай ў выкананні ансамбля народных інструментаў пад кіраўніцтвам М. Кузьмініча, фальклорнага ансамбля «Грамніцы» (мастацкі кіраўнік В. Зяневіч, хормайстар Л. Снапкова) натуральна ўпляталіся ў харэаграфічна-драматургічную структуру дзейства, напаўнялі яе жыццём, дапамагалі раскрыццю ідэі і вобразаў. Гэта выдатнае дасягненне. Паверце, ужо колькі разоў на балетных спектаклях і паказах часта слухаеш музыку ў віртуозным выкананні аркестра, якая існуе як бы паралельна, нават асобна ад пластыкі танца. А калі атрымліваецца гармонія — гэта сапраўднае мастацтва, жывое слова.

Нешта падобнае адбылося і ў свяце кафедры харэаграфіі Беларускага універсітэта культуры, якую цяпер даволі плённа ўзначальвае Святлана Гуткоўская. І хочацца пажадаць калектыву творчага плёну, выказаць глядацкую падзяку, рэжысёру-пастаноўшчыку і балетмайстру Вользе Бяляевай, а таксама адзначыць, што і ў вучобе бываюць святы. І гэта натуральна!